**І.М. Гоўзіч (Мінск, БДПУ)**

# М.І. МІШЧАНЧУК – ДАСЛЕДЧЫК СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

У адным са сваіх трактатаў “Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя дабрачыннасці” (1608) адзін з заснавальнікаў свецкага кірунку ў рэфармацыйнай публіцыстыцы Беларусі Андрэй Волан з пазіцый рэнесансавага гуманізму вылучыў важнейшыя якасці, якімі павінен валодаць грамадскі чалавек. Асноўныя з іх – дабрачыннае і сумленнае жыццё, прыстойныя паводзіны, пастаяннае імкненне да ведаў і жаданне іх удасканальваць, каб дасягнуць “зорных вяршынь славы”. Усё пералічанае ў поўнай меры стасуецца і да асобы Мікалая Іванавіча Мішчанчука – НАСТАЎНІКА, ПЕДАГОГА, НАВУКОЎЦА.

Клопаты пра вучняў і аспірантаў – сталі неад’емнай часткай жыцця Мікалая Іванавіча, вытокі падобных адносінаў да таленавітай моладзі сам навуковец тлумачыць наступным чынам: “Помню свае юнацтва... Шырокія калідоры адзінага, з адарваным вайной крылом, корпуса Мінскага педінстытута імя Максіма Горкага, поўныя святла прасторныя аўдыторыі. У адной з іх ідзе паседжанне літаратурна-творчага гуртка. Раман Тармола – цяпер вядомы беларускі паэт, Віктар Левін, Нолік Буткевіч. Без кіраўніка-выкладчыка, з гарачымі спрэчкамі, дыскусіямі. Нас, першакурснікаў, не пускалі на творчы “форум”, зачынялі дзверы. Але і за дзвярыма, стоячы блізка, мы чулі, што адбывалася ў “клубе”, дзе выспельвалася, гартавалася, набывала рысы мастацкасці звычайнае слова.

Пазней, спачатку наведваў, а затым і вёў пасля свайго настаўніка Міхася Арсенавіча Лазарука гурток “Крокі”, выпускаў аднайменны рукапісны альманах, адзін з нумароў якога дагэтуль захоўваю як напамінак пра светлы, поўны рамантыкі час. Шчыра, па-добраму зайздросціў хлапцам і дзяўчатам з філфака і журфака БДУ, літаратурная газета якіх займала паўсцяны, была надзіва змястоўная і прыгожа афармленая. Газета падрыхтавала грунт для літаб’яднання “Узлёт”, альманаха твораў маладых аўтараў пад руплівым апекаваннем цудоўнага чалавека Алега Антонавіча Лойкі. Каб так, як ён, клапаціліся пра парасткі маладых талентаў, ніва нашай прыгожай пісьменнасці была б значна багацейшая...

Не скажаш, што сёння мы не клапоцімся пра творчую змену. Клапоцімся. У розных ВНУ – па-рознаму. Пра таленты, якія нараджаюцца і выбруйваюцца на паверхню, як крынічны струменьчык, дбаюць раённыя, абласныя і цэнтральныя перыядычныя выданні (праўда, абмяжоўваючыся часцей літаратурнымі старонкамі). Аднак не пашкодзілі б у кожнай ВНУ, асабліва творчай, знаходзіць сродкі і друкаваць творы пачаткоўцаў і тым самым выхоўваць людзей больш **адоранымі**, **больш таленавітымі**, **здольнымі**, **падрыхтаваць, вывесці ў людзі сабе падобных**” (*З неапублікаванага*).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нягледзячы на тое, што М.І. Мішчанчук нарадзіўся на прыйску Майск Мазанаўскага раёна Амурскай вобласці ў Расіі, яго асноўныя навуковыя і творчыя дасягненні звязаны менавіта з беларускай крытыкай і літаратуразнаўствам, што, напэўна, абумоўлена яго генетычнымі, духоўнымі каранямі. Бацькі і дзяды яго з Беларусі былі высланы на Далёкі Усход “за грамату” (дзед дапамагаў пісаць аднавяскоўцам заявы пра выхад з калгасу).

Прафесар Мішчанчук М.І. на сённяшні час – адзін з аўтарытэтных навукоўцаў Беларусі, аўтар каля 60 падручнікаў, вучэбных і метадычных дапаможнікаў, манаграфій, кніг для настаўнікаў асабіста і ў сааўтарстве. Некаторыя з іх неаднаразова перавыдаваліся (“Беларуская літаратура на сучасным этапе”, “Уводзіны ў літаратуразнаўства. Хрэстаматыя”, “Гісторыя беларускай літаратуры. Падручнік для студэнтаў філфакаў ВНУ Беларусі”, “Сто лепшых сачыненняў на літаратурныя і вольныя тэмы”), сааўтар падручнікаў па беларускай літаратуры для вучняў IX, X, XI класаў, па рускай літаратуры – для вучняў XI класа агульнаадукацыйных устаноў Рэспублікі Беларусь, праграм факультатыўных заняткаў і курсаў на выбар па беларускай і рускай літаратуры.

Калі падлічыць усе выданні разам, то атрымліваецца вельмі ўнушальная лічба: М.І. Мішчанчук – аўтар звыш 400 публікацый як у нашай краіне, так і за яе межамі (ЗША, Англія, Польшча, Расія, Украіна). Яго кнігі, артыкулы ў перыядычным друку (“ЛіМ”, “Полымя”, “Роднае слова”, “Беларуская мова і літаратура”, “Настаўніцкая газета” і інш.), выступленні на навуковых канферэнцыях выклікаюць цікавасць чытачоў, спрыяюць павышэнню агульнага ўзроўню навучання слоўнаму мастацтву, атрымліваюць пазітыўную ацэнку грамадскасці. Прызнаннем заслуг у беларускім літаратуразнаўстве з’яўляецца яго сааўтарства ў напісанні новай акадэмічнай гісторыі беларускай літаратуры ў 4-х тамах.

Мішчанчук М.І. таксама паспяхова займаецца паэтычнай творчасцю, ён аўтар трох паэтычных зборнікаў (“Вернасць”, “Трывожуся за белы свет”, “Струна надзеі”), перакладамі рускай паэзіі на беларускую мову (вершы Я. Баратынскага, Ул. Хадасевіча, Г. Ахматавай, Г. Іванова, Ул. Набокава, Г. Кузьміной-Караваевай і інш.).

Але ўсё ж асноўныя навуковыя інтарэсы прафесара палягаюць у межах вывучэння нацыянальнага слоўнага мастацтва XX – XXI стст. у кантэксце рускай і сусветнай літаратур.

Літаратуразнаўчыя даследаванні М.І. Мішчанчука вызначаюцца грунтоўнасцю, структурнай і кампазіцыйнай цэласнасцю, лагічнасцю, што дазваляе навукоўцу адначасова аб’ядноўваць (сінтэзаваць) і размяжоўваць разнастайны матэрыял, уводзіць шматлікія паралелі, выкарыстоўваць дыскусійнасць.

Напрыклад, у адной з сваіх манаграфій “Класіка – сучаснасць – перспектывы: пра літаратурны працэс XX стагоддзя” М.І. Мішчанчук даследуе літаратурны працэс з пазіцый выяўлення ў ім тэндэнцый,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

характэрных не толькі беларускаму, але і рускаму і еўрапейскаму мастацтву. Так, напрыклад, у артыкулах пра Янку Купалу доказна сцвярджаецца дамінантная для ўсёй кнігі ідэя далучанасці спадчыны класіка да пошукаў і набыткаў мадэрнізму, пра сувязь творчасці Максіма Гарэцкага і ранняга Кузьмы Чорнага з экспрэсіянізмам і імпрэсіянізмам, Аркадзя Моркаўкі з традыцыямі класічнай філасофскай лірыкі (у тым ліку рускай паэзіі XIX стагоддзя). Большасць раздзелаў названага навуковага даследавання напісана зацікаўлена, пераканальна, прысвечана творчасці паэтаў і пісьменнікаў другой паловы XX стагоддзя (А. Куляшоў, П. Броўка, Ул. Караткевіч, А. Сербантовіч, Яўгеніі Янішчыц і інш.).

Разважанні М.І. Мішчанчука пра творчасць класікаў і сучаснікаў (прадстаўнікоў як XX, так і XXI стагоддзя) вызначаюцца комплексным падыходам да аналізу асаблівасцяў іх творчай манеры, грунтоўнасцю тэарэтычных высноў і палажэнняў, як, да прыкладу ў артыкуле пра асаблівасці стылю Максіма Танка: “Індывідуальны стыль пісьменніка – гэта своеадметнасць яго поглядаў на жыццё, рэалізаваная ў сістэме светапоглядных, вобразных арыенціраў і падпарадкаваных ёй манеры пісьма, сродкаў выяўленчасці, словаўжывання і словаўтварэння і іншых фактараў. Аднак “падганяць” пад паняцце “стыль” усё, што датычыцца вобразатворчасці, – занятак няўдзячны і няплённы. Падобны падыход станецца ў выніку канстатаваннем – больш-менш доказным – наяўнасці амаль у кожнага (за рэдкім выключэннем) пісьменніка адных і тых жа змястоўна-фармальных прыкмет: майстэрскае раскрыццё маральна-этычных праблем, імкненне спраецыраваць асабістыя погляды на свет, на агульнанародны вопыт, шырокі “ахоп” з’яў рэчаіснасці, майстэрскае валоданне мовай, тропамі і г. д. У падобных разважаннях растворацца назіранні пра непадобнасць творчых індывідуальнасцей. Таму лепш ісці да разумення адметнасці творчых індывідуальнасцей мастакоў слова шляхам доказу ад супрацьлеглага: шукаць рысы непадабенства ў спадчыне Максіма Танка і Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Пімена Панчанкі, Аркадзя Куляшова, Аляксея Пысіна, Алеся Салаўя і іншых аўтараў” [1, с.121].

Даследаванні М.І. Мішчанчука, прысвечаныя нацыянальнаму мастацтву XX – XXI стагоддзяў (“Ёсць у паэта свой аблог цалінны”, “Беларуская літаратура на сучасным этапе”, “Літаратура XX стагоддзя: спроба пераасэнсавання”, “Класіка – сучаснасць – перспектывы: пра літаратурны працэс XX стагоддзя” ды многія іншыя), пашыраюць і паглыбляюць веды рэцыпіентаў у галіне беларускага літаратуразнаўства.

**Літаратура**

1. Мішчанчук, М.І. Стыль Максіма Танка: кантэкстуальны аспект / М.І. Мішчанчук // Сёмыя Танкаўскія чытанні. Да 95-годдзя Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка: зб. навук. арт. / рэдкал. Г.Я. Адамовіч [і інш.], адказны рэд. А.І. Лугоўскі. – Мінск : БДПУ, 2010. – С. 121 – 123.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ